**Алімпіядныя заданні, 5 клас**

1. **Падлічы колькасць мяккіх зычных у словах, пастаў адпаведную лічбу.**

| | |
|---|---|
| Салаўі -__; | дзіўныя -__; |
| скарб- __; | збіраць - __; |
| скінуць -__; | схіліць - __; |
| з лесу - __; | Айчына -__; |
| снегавік - __ | доблесць -__. |

2. **Перакладзі тэкст на беларускую мову.**

Вместе со снегом в нашей местности появились зимние гости - снегири. Летом они живут на севере. Их можно увидеть на лесной опушке, в парке, на бульваре, на берёзе около дома. Вот птицы сидят на ветке яблони в саду. Круглые, красные, словно яблоки (По И. Соколову-Микитову).

3. **У тэксце задання № 2 вызначы стыль тэксту і тып маўлення.**

_______________________________________________

**4.З прапанаваных спалучэнняў слоў выберы словазлучэнні, запішы іх нумары.**

1. у музычнай школе;
2. наступіла вясна;
3. добры друг;
4. маці і сын;
5. малюю пэндзлем;
6. самая прыгожая;
7. на стадыёне;
8. ісці па лесе;
9. вучыцца старанна;
10. конкурс малюнкаў.

_____________________

4. **Падкрэсліце словы, у якіх неабходна ўставіць літару в.**

…уголле, …окны, …Узда, …улачка, …остры, …ордэн, …оптыка, …улей, …урна, …універсітэт, на…огул, …устрыца, …окаць, па…уцінне, па…ук.

5. **Расстаў у вершы неабходныя знакі прыпынку, устаў прапушчаныя літары, падкрэслі ў сказах граматычныя асновы.**

Лось

Лось б…зрогі выбе… з гаю
Дзе звініц… птушы…ы грай.
Пастаяў на полі з краю
І наза… пабе… у гай.
Сле… панюхаў ля дарогі
Затрубіў і ў смутку с…ціх.
Лось згубіў у с…нежні рогі
І цяпер шукае іх.

*(В. Гардзей)*

**7. Растлумачце лексічнае значэнне слова "гай" з верша. Якія дрэвы растуць у гаі?**

___________________________________________________________________

___________________________________________________________________

8. **Закончы прыказкі.**

Дурны раскідае, а разумны ________________________________;

Дзе маці нарадзіла, _____________________________________;

Чужым розумам _________________________________________;

Людзей слухай, _________________________________________;

У сваім краі,____________________________________________;

9. **Назаві аўтара і твор. Выберы з прапанаваных мастацкі сродак, акрамя параўнання, ужыты ў гэтым урыўку?**

Лядок закашляў, заіскрыўся,
На срэбра-друзачкі пабіўся;
Ляцяць крупінкі ледзяныя,
Бы ўлетку пырскі дажджавыя…

___________________________________________________________

а)Метафара;

б)эпітэт;

в)паўтор.

**10. Злучы аўтараў з назвамі твораў, запішы спалучэнні.**

| | |
|---|---|
| 1. Максім Багдановіч | а) “Нямоглы бацька” |
| 2. Якуб Колас | б) “Ля вогнішч начлежных” |
| 3. Міхась Лынькоў | в) “На рэчцы” |
| 4. Максім Танк | г) “Зімой” |
| 5. Уладзімір Караткевіч | д) “Васількі” |

_______________________________________________